...ЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН ЯДНАЙЦЕСЯ

Чырвоная Зьмена

№ 241 (1208) || ПЯТНІЦА, 17-га кастрычніка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

УСЕ НА ФРОНТ УБОРКІ БУЛЬБЫ

У мэтах выкананьня заданьня скончыць уборку бульбы да 20 кастрычніка, ЦК ЛКСМБ прапануе комсамольскім арганізацыям мобілізаваць усе сілы на ўборку бульбы.

Утварайце брыгады з гарадзкіх комсамольцаў, моладзі, арганізуйце комсамольцаў, моладзь і насельніцтва вёскі для дапамогі ва ўборцы бульбы ў саўгасах і колгасах.

Назначаныя на 18 кастрычніка райконфэрэнцыі адмяніць і перанесьці на лістапад месяц.

Конфэрэнцыі, якія вызначаны на 25 кастрычніка і 1 лістапада не адкладваюцца. Нам. Сэкр. ЦК ЛКСМБ РЫНДЗІЧ.



КОМСАМОЛЬСКІЯ РЭЗЭРВЫ—НА УБОРКУ БУЛЬБЫ

...воднага кілё бульбы зямлі— ТАКІ ЗАГАД ПАРТЫІ

ЦК ЛКСМБ сваёй пастановаю ад 28 верасьня і пасьлядоўным ...агам тэлеграм патрабаваў ад раённых комсамольскіх камітэтаў і ...ск тэрміновай мобілізацыі ўсіх сваіх сіл і сіл працоўнай грамадзкасьці на хутчэйшае выкананьне плянаў загатоўкі і капаньня бульбы. Аднак, ня гледзячы на ўсе катэгорычныя патрабаваньні ЦК ЛКСМБ ...рэктывы партыі скончыць 20 кастрычніка ўборку бульбы, паасобныя комсамольскія арганізацыі, як Клічаўская і іншыя, не далі ...рнага разгону ў гэтай працы, а ганебна бязьдзейнічалі.

У выніку безадказнасьці шэрагу партыйных, комсамольскіх, колгасна-коопэрацыйных і іншых арганізацый, плян уборкі і загатоўкі бульбы за першую палову ўдарнага месяцу кастрычніка выкананы зусім нездавальняюча. Плян адгрузкі бульбы за першыя два тыдні даў, ...ест 75000 тон, толькі 47000 тон, што складае 62 процанты заданьня.

Надалей гэтыя ганебныя тэмпы працы нецярпімы. Комсамол павінен па-сапраўднаму, па-бальшавіцку накіраваць свой малады энтузіязм, павінен з усёй сваёй напорыстасьцю пайсьці ў рашучую бойку за выкананьне плянаў уборкі і адгрузкі бульбы к тэрміну.

Мы патрабуем ад камітэтаў і ячэек падвоіць тэмпы і разгон працы.

За 10-дзёньнік дня ўраджаю і колектывізацыі мы павінны поўнасьцю ліквідаваць прарыў у выкапцы бульбы. Не павінна застацца ...днаго колгасу, саўгасу, ні аднаасобнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі, дзе ня была-б к тэрміну выкапана бульба.

Даючы рашучы адпор кулацтву і яго агентам, якія розными ...хамі праламваючы ў камсады, распаўсюджваючы розную хлусьню, ...раюцца сарваць выкананьне плянаў загатоўкі і адгрузкі бульбы,— ...абавязаны перад партыяй і рабочаю клясай забясьпечыць сваёй ...рнай працай адказнейшы вучастак—забясьпечаньне пролетарскіх ...траў бульбай.

Ня можа быць ніякіх разважаньняў і опортуністычнага румзаньня. Усе, як адзін,—у бой за бульбу!

...куль, будзеце бязьдзейнічаць

...улацтва зрывае выкананьне плянаў

...адзвычайна слаба праходзіць бульбазагатоўчая кампанія ў Клічаўскім ...не. Кантрольныя лічбы не даведзены да вёсак, ня дана цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам.

...а шэрагу вёсак, дзякуючы адсутнасьці масавай працы сярод колгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, кулацтва пралезла ...розкі садзейнічаньня бульбазагатоўкам і зрывае выкананьне плянаў. ...вёсцы Сідзіча кулацтва на палову ...вала выкананьне пляну.

...дначасова не мобілізавана ў дапамогу ...тковай меры грамадзкасьць вёскі ...дапамогу колгасам ва ўборцы бульбы.

У паасобных колгасах—„Наша ...ша", імя Калініна, „Уперад",— ...ль не распачата ўборка бульбы.

...омсамольская-ж арганізацыя прыняла нездавальняючы ўдзел і не мобілізавала поўнасьцю масы комсамольскай і працоўнай моладзі на дапамогу. ...ком партыі таксама ня прыняў ...рэбных захадаў да мобілізацыі ...оўнай грамадзкасьці, а абмежа...ся толькі тым, што прыпягнуў да ...елу ў выкапцы бульбы вучнёўскія ...ганізацыі.

...аённы камітэт партыі і комсамолу ...вінны зараз-жа ліквідаваць прарыў ...выкапцы бульбы, мобілізаваўшы ўсе ...ы і грамадзкасьць раёну на дапамогу колгасам. Юнкор Мяцёлка.

Усе мобілізаваны на капаньне бульбы

Клімаўскі райком комсамолу мобілізаваў усю комсамольскую арганізацыю на ліквідацыю прарыву ва ўборцы бульбы. За апошні час з гораду штодня накіроўваюцца комсамольскія брыгады і беспартыйная моладзь на дапамогу колгасам у капаньні бульбы. У пачатку кастрычніка былі накіраваны ў колгасы брыгады з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў ліку 140 чалавек, якія адпрацавалі тыдзень. 9 кастрычніка накіравана 160 чалавек комсамольцаў і 40 чалавек беспартыйнай моладзі. 12 кастрычніка ўсе вучні старэйшага концэнтру саміголкі.

Комсамольскі колектыў колгасу „Магілеўшчына" абвясьціў сябе ўдарным па выкапцы бульбы і ліквідацыі прарыву ў правядзеньні сельска-гаспадарчых кампаній. Праца брыгад па дапамозе колгасам праходзіць з посьпехам. Брыгады, побач з выкапкай бульбы, разгарнулі працу па арганізацыі чырвоных абозаў да дня адчыненьня 8 райконфэрэнцыі комсамолу.

А. Варановіч.

Вучні на дапамогу колгасам

Вучні Капцэвіцкай фабрычна-заводзкай сямігодкі Петрыкаўскага раёну арганізавалі з 30 чал. брыгады па дапамозе колгасам „Чырвоны Сьцяг" і іншым у капаньні бульбы.

За пяць дзён сваёй працы брыгады дапамаглі колгасу выкапаць каля 2 з пал. тысяч пудоў бульбы і вывезьці 150 вазоў гною.

Смоліч Андрэй.

Скончылі ўборку бульбы

Школа ФЗВ Бабруйскага комбінату, у колькасьці 190 чалавек, разьбіўшыся на 5 брыгад, накіравалася па колгасах: Качарычы, „Новы Быт", „Ломпава" і комуна імя Вароўскага. Брыгады адпрацавалі ў колгасах 7 дзён. Зараз уборка бульбы ў гэтых колгасах поўнасьцю скончана.

ПЕРЭЛЬМАН.

Дапамагаем колгасам скончыць уборку бульбы і організоўваем новы прыліў у колгасы

ГЛУСК, 15. (Ад нашага спэцкора). У раёне мобілізаваны ўвесь партыйны і комсамольскі актыў для выкананьня гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў. Пляны выкапкі і загатоўкі бульбы выконваюцца з посьпехам.

На ўборку бульбы мобілізаваны вучні сямігодак, сябры профсаюзаў. У колгасе „Серп і Молат", „Леніна", „Чырвонае Арэшша" скончылі ўборку бульбы і караньплодаў. Брыгады пераключылі сваю працу на дапамогу ва ўборцы бульбы ў сьвінаводчым колгасе.

Дзякуючы разгорнутай масавай працы сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, апошнія вышлі на дапамогу саўгасам і колгасам. У саўгасе „Харамцы" 1-га кастрычніка працавала 18 чалавек. У саўгасе Халопенічы 13 кастрычніка працавала 139.

Дрэнна праходзіць уборка бульбы ў Капелаўскім і Авем'янскім с-с, дзе таксама слаба разгорнуты і хлебазагатоўкі.

У выніку масавай працы, у Беразоўскім с-с організаваны новы колгас імя 10 зьезду ЛКСМБ, а колгас імя Калініна стварыў ініцыятыўную групу па вярбоўцы аднаасобнікаў у колгасы, якая накіравалася па вёсках.

Разінскі.

Загатоўчыя організацыі бязьдзейнічаюць

Кулак заданьня ня выканаў

СТАРЫЯ ДАРОГІ, 16 (Ад нашага спэцкора). На сёньня адпраўлена два эшалёны бульбы ў колькасьці 60 вагонаў. Гэты эшалён з прычыны галавацяпства стаяў 10 гадзін у Асіпавічах. 15-га адпраўка эшалёну сарвалася з-за нераспарадчасьці мясцовых організацый, якія ўнесьлі блытаніну, сарваўшы плянавую пагрузку эшалёну.

Комсамольская організацыя ня поўнасьцю мобілізавана на бульбазагатоўкі. Коопэрацыйныя організацыі, здаволіўшыся першымі посьпехамі організацыі комсамольскага эшалёну, апусьцілі рукі. Спажывецкая коопэрацыя плян адгрузкі бульбы ў Маскву выканала толькі на 30 процантаў.

На бульбазагатоўках працуюць толькі брыгады ЦК. Адгружаецца бульба дрэннай якасьці, дробная.

Пагражаючае становішча з капаньнем бульбы,—да вызначанага тэрміну ня выканалі плян на 50 проц. Колгасы і аднаасобнікі выканалі плян загатоўкі бульбы на 10 проц. Не праводзяцца заданьні кулацкім гаспадаркам, якія ня выканалі заданьняў па бульбазагатоўках.

Правядзеньне бульбазагатовак ня ўвязваецца з організацыяй новага прыліву ў колгасы, наадварот—маюцца паасобныя колгасы, дзе назіраюцца факты адліву.

Дзень ураджаю і колектывізацыі ў сельсаветах праваліцца, некаторыя сельсаветы адклалі яго правядзеньне на 19-ае кастрычніка.

19-га накіроўваем пролетарам Масквы апошні эшалён бульбы.

В. Самуцін.

З гонарам выканалі сваё заданьне

4 кастрычніка Старобінскі райком комсамолу, згодна тэлеграмы ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі комсамольскіх мас на выкапку бульбы і організацыі чырвоных абозаў бульбы, мобілізаваў мястэчковую комсамольскую організацыю, якая на працягу двух дзён працавала па вёсках, організоўваючы чырвоны абоз. У выніку праведзенай працы, заданьне нарыхтаваць 400 тон бульбы комсамольская організацыя выканала.

Юрка Бялько.

ПАСТАНОВА ЦК ЛКСМБ

аб ходзе мобілізацыі на Донбас

Прызнаць, што мобілізацыя на Донбас праходзіць нездавальняюча. Ня гледзячы на шэраг указаньняў ЦК аб падрыхтоўцы правядзеньня мобілізацыі, шэраг РК мобілізацыі ня выканаў, астатнія-ж праводзяць мобілізацыю абы выканаць колькасьць, не зьвяртаючы ўвагі на якасьць. Пасылаюць падлеткаў, фізычна неразьвітых і нявытрыманых комсамольцаў (Пухавічы, Ворша, Чарэя), дзякуючы гэтаму нагляд ецца дэзэртырства і распаўсюджваньне ўсялякіх няпраўдападобных чутак аб прыёме мобілізаваных, умовах жыцьця, адсылцы фізычна неразьвітых назад і г. д.

Улічыўшы ўсё гэта, ЦК прапануе: закончыць мобілізацыю на Донбас 20 кастрычніка, 21-X павінны быць накіраваны апошнія эшалёны, дадаткова для выкананьня пастановы ЦК УсеЛКСМ мобілізаваць 400 чал., разьмеркаваўшы гэту лічбу па раёнах.

Прапанаваць усім РК прымаць да дэзэртыраў самыя суровыя меры, ствараючы вакол гэтых ганебных учынкаў шырокую грамадзкую думку.

За невыкананьне пастановы ЦК аб мобілізацыі ў Донбас, ЦК пастанавіў даць вымовы Бюро Журавіцкага, Хоцімскага, Крычаўскага і Ляднянскага РК ЛКСМБ.

ПРАВАОПОРТУНІСТЫЧНАЯ СТАЎКА НА САМАЦЁК НЕ ПАБІТА

Дзесяткі тысяч працоўнай дзетвары яшчэ засталіся па-за школамі. Важнейшая палітычная задача—ліквідацыя няпісьменнасьці і ўвядзеньне ўсеагульнага навучаньня—многімі „гора-працаўнікамі“ пушчана на самацёк. Гэта опортуністычная стаўка павінна быць біта!

„Комсомольская Правда“ распачала ўсесаюзны агляд усеагульнага навучаньня. Адзначаючы катастрафічнае становішча з усеагульным навучаньнем па БССР, мы ўключаемся ва ўсесаюзны агляд

Першыя вынікі—трывожны сыгнал

Прайшло ўжо больш паўтара месяца з таго часу, як павінен быў пачацца навучальны год. Пачатак навучальнага году сёлета супадае з пастановай партыі аб увядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня. Зараз ужо неабходна падвесьці некаторыя вынікі.

А вынікі сумныя.

Ва многіх школах да 10-га кастрычніка не пачаліся заняткі, яшчэ толькі пачалі рамантаваць школы. Што-ж рабілі гэтыя людзі да гэтага часу?

Школы гарачымі сьнеданьнямі не забясьпечаны, замест сьнеданьняў кормяць абяцанкамі. Інтэрнаты і школы не падрыхтаваны да заняткаў. Вучні знаходзяцца ў пакоях бяз вокан і печаў. Холад і вецер не даюць магчымасьці ня толькі вучыцца, але і жыць. Але людзі, якія павінны адказваць за справу ўсеагульнага навучаньня, ня цікавяцца гэтым.

Комсамол узяў на сябе шэфства над усеагульным навучаньнем і да гэтага часу яго не ажыцьцёвіў. Шмат ячэек ня ведае аб пастанове партыі аб усеагульным навучаньні. Пытаньне ажыцьцяўленьня гэтай пастановы, барацьба за політэхнічную школу яшчэ не заняло пачэснае месца ў працы ячэек.

Трэба каб з гэтага зрабілі вывады раённыя комсамольскія організацыі.

Узяты абавязак шэфства над усеагульным навучаньнем ня можа быць толькі ўрачыстай дэклярацыяй, комсамол павінен прымаць паўсядзённы ўдзел у ахопе ўсёй пролетарскай дзетвары школамі, у перабудове школ на рэйкі політэхнізацыі.

Сёньня мы зьмяшчаем весткі з месц, якія сыгналізуюць аб тым, што справа ўсеагульнага навучаньня яшчэ не пастаўлена на належную вышыню, што ня ўся дзетвара ахоплена школамі, што на мясцох заўважваюцца скажэньні. Уб усім гэтым мы даводзім да ведама Наркомасьветы з тым, каб ён прыняў належныя захады да палепшаньня становішча ўсеагульнага навучаньня.

Аднačасова з гэтым мы патрабуем прыцягненьня да суровай грамадзкай адказнасьці тых настаўнікаў, якія пакідаюць школы і ўцякаюць з фронту нашага культурнага будаўніцтва. Шмат школ засталося без настаўнікаў.

Грамадзкасьць павінна сурова асудзіць гэтых дэзэртыраў, а комсамольскія органы—прыняць адпаведныя організацыйныя вывады.

Ставяць палкі ў колы

Сьмілаўская яўрэйкая сямігадовая школа правяла вялікую працу па падрыхтоўцы да навучальнага году. Быў праведзен цэлы шэраг мерапрыемстваў для забясьпечаньня вучняў неабходным інтэрнатам, гарачым сьнеданьнем і абуткам. Усё гэта зроблена з мэтаю ахапіць яшчэ больш дзетвары і правесьці як належыць справу ўсеагульнага навучаньня.

Першыя 15 дзён вучобы паказалі, што пры належнай організацыі вучобы і адданасьці справе ўсеагульнага навучаньня справу можна добра паставіць. Але за апошні час заўважваюцца нейкія надзвычайна няўважлівыя адносіны да школы і ўсёй працы.

Школа адчувае вялікі недахоп у настаўніцкіх кадрах. Ня гледзячы на ўсе напаміны з боку школы,—органы народнае асьветы … робяць для забясьпечаньня … настаўнікамі.

Імкненьне організаваць … кае харчаваньне сустракае … коды з усіх бакоў. Шэраг … коў мясцовых організацый … фармальна бюрократычна … да справы і ня ідуць … організацыі харчаваньня …

Ужо трэці год, як школ… піонэр-працаўніка, а … гэта прадбачана. Сёлета … ма няма. Местачковы … вычайна марудзіць з … каштарысу школы, і … няма гарантыраванай ма… базы.

Трэба хутчэй выправі… недахопы і даць школ… масьць працаваць.

Места…

Па волі хваль

Навучальны год у Вульскім раёне распачаўся, але ніякага пералому ў організацыі ўсеагульнага навучаньня да гэтага часу няма.

У гэтым годзе павінны працаваць 62 першапачатковыя двух—і аднакамплектавыя школы, адна сямігодка, адна школа колгаснай моладзі і 2 пяцігадовыя школы. Па недакладных падліках, школы павінны ахапіць 900 дзяцей ва ўзросьце ад 8 год. і таксама каля 280 чалавек у 5-ыя групы.

Будаўніцтва новага двухпавярховага памяшканьня ў м. Вульле ў гэтым годзе сарвана. Пляны будаўніцтва ня выкананы больш, як на 60 проц., бо сьцены толькі даведзены да паловы, у той час, калі патрэбна было будаўніцтва закончыць у гэтым навучальным годзе.

Прэзыдыум Райвыканкому, заслухаўшы гэтую справу даў установку і прапанаваў як мага хутчэй скончыць будаўніцтва. Для ажыцьцяўленьня гэтай пастановы райвыканкомам нічога ня было зроблена і пастанова засталася толькі пастановай.

У першапачатковай школе не дабрана 800 чалавек, а школы пачалі ўжо працаваць. С-с зусім па галавацяпску адносіліся да ўкомплектаваньня школ. Дзеці заможнікаў залезьлі ў школы а дзеці беднякоў не мэглі паступіць у школу.

Па раёну павінны адчыніцца 8 новых першапачатковых школ. З гэтых 8-мі пачалі сваю працу толькі 2, астатнія з-за непадрыхтаванасьці памяшканьняў, адсутнасьці належнага абсталяваньня і пэдагогічных кадраў сваю працу не разгарнулі. У Хопінскім сельсавеце маецца 3 школы без настаўнікаў, заняткі і ўкомплектаваньне не праведзена. Адна школа ў гэтым сельсавеце „будуецца“, але печкі і вокны да гэтага часу ня зроблены.

У Вусайскім сельсавеце, у вялікай вёсцы Кавалёўшчына школа бяз вокан і печак таксама ня мае настаўнікаў. У Вусьвейскім сельсавеце 6 школ, у двух школах патрабуецца канчатковы рамонт, заняткі пачаліся ў школах з паразьбіватымі шыбамі а сельсавет і не паклапаціўся зрабіць належны рамонт.

Ва ўсёй працы па ўсеагульнаму навучаньню і правядзеньню навучальнага году—галавацяпскія адносіны, спадзяваньне на самацёк.

Ня гледзячы на папярэджаньні райкому партыі прарывы ў падрыхтоўчы пэрыод ня былі ліквідаваны і зараз ня ліквідуюцца, а адпаведныя організацыі мабыць не жадаюць займацца такімі „дробязямі“.

Мы б'ем трывогу аб зрыве ўсеагульнага навучаньня ў раёне.

Неабходна з усёй рашучасьцю ўдарыць па гэтых галавацяпах, якія спадзяючыся на самацёк, не організоўваюць працы і пускаюць такія адказьнейшыя мерапрыемствы па волі хваль.

С. КАРПУШЭНКА.

Мары... мары...

Ленінскі комсамол — шэф усеагульнага навучаньня.

Справа ўсеагульнага навучаньня ў некаторых раёнах пушчана на самацёк.



— Вось, каб так,—па-трошку, самацёкам.. Вось было-б жыцьцё!

У баку ад падзей

Бюро комсамольскага колектыву, ст. Ворша пытаньнем усеагульнага навучаньня зусім ня цікавіцца.

Ні на вузлавым комсамольскім сходзе, ні на бюро колектыву гэтае пытаньне ня ставілася і нідзе не абгаварвалася. Бюро колектыву ня ведае, ці ўсе дзеці ахоплены ўсеагульным навучаньнем. Гэтаксама праходзіць міма комсамолу і справа політэхнізацыі школ.

Хадневіч.

„Будуюць“ і „рамантуюць“

Навучальны год у Пухавіцкім раёне сустрэлі непадрыхтаванымі.

Дзеці ва ўзросьце 8-11 год школамі не ахоплены, ня гледзячы на тое, што заняткі ўжо распачаліся. Інтэрнатаў няма. Шэраг школ усё яшчэ „будуецца“ і „рамантуецца“, як кажуць галавацяпы з РВК, якія ня ведаюць або не жадаюць ведаць аб тым, што навучальны год ужо пачаўся.

Дзеці беднаты ніякай дапамогі не атрымоўваюць. Усё гэта сыгналізуе аб тым, што райком комсамолу і ячэйкі да гэтага часу нічога не зрабілі, каб палепшыць становішча з усеагульным навучаньнем.

Вучоту няпісьменных няма.

М К-а.

Не жадаюць рэагаваць

У Сьвіслацкай сямігодцы пададзена столькі заяў у школу, што магчыма было-б організаваць тры раўналежныя групы 5-ай, 6-ай і 7-ай клясы, бо маецца па 80-90 заяў у гэтыя групы, але райінспэктар райасьветы ня ведае, як у гэтым годзе будзе.

Настаўнікаў не хапае для школы. Нехта, калісьці, дзесьці выпісваў, але пакуль што ў школах настаўнікаў няма і заняткі ўвесь час зрываюцца. Ня лепш пастаўлена праца і з забясьпечаньнем вучняў інтэрнатамі. Пакоі надзвычайна брудныя, непабеленыя, катлоў няма. Гэтыя інтэрнаты знаходзяцца ў такім становішчы, што жыць і вучыцца няма ніякай магчымасьці.

У такім становішчы знаходзяцца школы Сьвіслацкага раёну перад пачаткам навучальнага году. На ўсе сыгналы газэты „Чырвоная Зьмена“ інспэктар народнай асьветы ўвагі не зьвяртае і адказвае з усьмешкай і ігнараваньнем.

Юнкор.

Не хапае 28 настаўнікаў

У Жлобінскім раёне не хапае 28 настаўнікаў. Інспэктарыят нарасьветы не клапоціцца, каб забясьпечыць школы настаўнікамі.

Камісія па садзейнічаньню ўсеагульнаму навучаньню організавана толькі на паперы, ніякай працы да гэтага часу не правяла. Ня лепш пастаўлена і праца мэтодычнага раённага бюро, якое, мабыць, абвясьціць спаборніцтва (далёка не соцыялістычнае) з камісіяй па ўсеагульнаму навучаньню на большую бязьдзейнасьць. Хто выйдзе пераможцаю—невядома.

З рамонтам і пабудовай школ у раёне справа пастаўлена надзвычайна кепска, бо сёлета ніадна школа ня будзе скончана.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што становішча з усеагульным навучаньнем, з ажыцьцяўленьнем пастановы 16 зьезду партыі па раё не небясьпечнае і што павінны быць прыняты безадкладныя захады да палепшаньня гэтага становішча. Самацёк, бязьдзейнасьць, якія існуюць да сёньняшняга дня, павінны быць раз і назаўсёды зьнішчаны, бо інакш адпаведныя органы павінны будуць сказаць сваё слова.

Паляўцоў

КАР-Р-РА-А-ВУЛ!

Школы засталіся без наст…
(З допісаў…



НАСТАЎНІКІ:—Браткі,—ратуйцеся! Уцякай, хто можа,—навучальны …

Нам пішуць:

У шмат якіх школах Бягомльскага раёну да сучаснага моманту не праведзены рамонт, у Слабодзкай школе, Кадлубіцкага сельсавету. Печкі параскідаліся, вокны ня зроблены, з комгас нават і ня думае адпусьціць сродкі на рамонт. Некалькі раз настаўнік зварочваўся да раённага інспэктара Народнай Асьветы Навіцкага і старшыні комгасу Асіповіча, але яны адносяцца надзвычайна да справы дрэнна і кормяць „завтракамі“.

Надыходзіць зіма і ў школе становіцца немагчымым вучыцца. Асіповіч і Навіцкі на гэта не зьвяртаюць увагі, бо, па іхняму, мабыць лепш распусьціць школу, чымся пабудаваць коміны і ўставіць вокны.

Паўлюк.

* * *

У вёсцы Васількова Дуброўскага сельсавету (Рэчыцкі раён) існуе першапачатковая школа. У гэтым годзе ў школу прыслалі 2 настаўнікаў, але Дуброўскі сельсавет не паклапаціўся адрамантаваць для навучальнага году, рамантаваць яе тады, ка… ўжо былі пачацца заня… ідзе яшчэ да сёньняшняга … настаўнікі ня могуць … да вучобы.

Давед…

* * *

У вёсцы Смык-Слабада… кага р-ну яшчэ не пача… кі ў першапачатковай ш… настаўнік выехаў, а нов… паглядзеў ды... уцёк.

Дзеці жадаюць вучыцца … ўчынку гэтага дэзэртыра … ны год яшчэ не пача… будзе?

А. Нал…

* * *

У Бардынскай школ… скага раёну навучальны … ся, але школа ахапіла н… мала дзяцей ва ўзросьце, … лягае ўсеагульнаму аба… першапачатковаму наву…

А. …

Напярэдадні раённых конфэрэнцый і X зьезду ЛКСМБ

РАШУЧА УДАРЫЦЬ ПА НЯДБАЙНАСЬЦІ І НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦІ КІРАУНІЦТВА

а раённых конфэрэнцый ЛКСМБ засталіся лічаныя дні. Аднак, паступаючыя з месц матар'ялы сьведчаць аб тым, што шэраг РК і ячэек ЛКСМБ за справамі. . праглядзелі організацыю падрыхтоўчай працы да райконфэрэнцый і X зьезду ЛКСМБ

Мы патрабуем неадкладна выправіць гэтую памылку

РК і ячэйкі комсамолу павінны спыніць бязьдзейнасьць і агульныя разважаньні і ўключыцца ў ход разгорнутай падрыхтоўкі да райконфэрэнцый і X зьезду ЛКСМБ

Сустрэчны плян падрыхтоўкі Лепельскай організацыі да IX зьезду УсеЛКСМ

Абмяркоўваючы ініцыятыву Выскага РК КСМ аб утварэньні сустрэчнага комсамольскага пляну падрыхтоўцы да 9-га зьезду комсамолу, Лепельскі раённы камітэт ...аліў уключыцца ў агульны ўсе...ны комсамольскі марш падрых...кі да 9-га зьезду УсеЛКСМ і ...а зьезду ЛКСМБ.

Задачы ячэек

. На аснове сустрэчных пляпаў ...гасу забясьпечыць стопроцантнае ...ананьне і перавыкананьне за...ляў па асеньняй слўбе, убор...хлебанарыхтовак і нарыхтовак ...продуктаў, па датэрміноваму ...еньню ўсіх падаткаў, падпісцы ...пазыку „5-годка ў 4 гады“, ор...ўючы комсамольскія пасты на ...аючых вучастках.

. Узяць пад асобы кантроль ...проц. выкарыстоўваньне і ўдар...работу машын.

. Выканаць кантрольныя лічбы ...будаўніцтву сьвінарнікаў, уком...таваць іх сьвінаматкамі, дабі...чыся павялічэньня іх лічбы,—...ст 600 галоў да 700 галоў, ...сама выканаць заданьне па сі...ваньню.

. Узяць практычныя абавяза...ствы па організацыі новых кол...ў і весьці працу па вярбоўцы ...х сяброў.

. Уцягнуць на 100 проц. ком...льцаў ва ўдарныя брыгады з ...язковым заключэньнем умоў і ...ыцом абавязацельстваў, па ...ыцыю вытворчасьці працы і ...; з абавязковай праверкай іх ...менш аднаго разу ў месяц. Увес...адну гадзіну ў тыдзень на ...ыю аграномічнай граматы.

6. Выкарыстоўваючы вопыт опэратыўна-плянавых груп, вытворчых груп і брыгад, забясьпечыць перавод соцспаборніцтва на вышэйшую ступень.

7. Організаваць збор прапаноў па працы колгасу в разьліку ня менш аднэй прапановы на кожнага комсамольца, у кожным колгасе ўвесьці чырвоную кнігу прапаноў і ўстанавіць над ёю піонэрскае шэфства.

8. Дабіцца перабудовы колгаснавытворчага паходу комсамолу ў масавы паход усёй грамадзкасьці раёну.

9. Разгарнуўшы культурную эстафэту, зрабіўшы яе масавым рухам грамадзкасьці раёну. Організаваць суботнікі па рамонту школ, нарыхтоўцы апалу і г. д.; прымацаваць школы да колгасаў; організацыяй лікпунктаў ахапіць усе 100 проц. напісьменных.

10. Для лепшых колгасьнікаў з батракоў і беднякоў утварыць у кожным колгасе бытавыя комуны.

11. Школамі, навічкоў і тэорэтычнымі гурткамі ахапіць на ўсе 100 проц. комсамольцаў.

12. Раённымі курсамі перападрыхтовак актыву ахапіць 30 чалавек.

13. Правядзеньнем організацыйнай перабудовы працы ячэек дабіцца, каб стрыжнем усёй работы, кожнага вучастку былі пытаньні гаспадаркі—колгасу.

14. Да зьезду ўцягнуць у шэрагі комсамолу на ўсе 100 проц. батрацкую моладзь. Кожная ячэйка павінна мець дакладны вучот неахопленай організацыяй моладзі організуючы сярод яе выхаваўчую работу.

15 Організацыяй атрадаў грамадзкага буксіру кооперацыі забясьпечыць удзел комсамолу ў організацыі зачынсных разьмеркавальнікаў, у правядзеньні агляду работы магазынаў, сталовак і г. д.

16. Організацыяй скразной брыгады наладзіць кантроль за ходам нарыхтоўкі бульбы і гародніны.

17. 5 чалавек лепшых ударнікаў у колгасе вылучыць на працу у кооперацыю.

18. На ўсіх сходах ячэек абмяркаваць ліст „Комсомольской Правды“ ад 2-га кастрычніка і організаваць шырокі збор прапаноў па працы КСМ.

19. Абмяркоўваючы гэтыя заданьні, ячэйкі павінны скласьці свае сустрэчныя пляны падрыхтоўкі да зьезду, організуючы соцспаборніцтва на іх выкананьне і перавыкананьне.

20. Абавязаць ячэйкі: 18 кастрычніка - даць рапарт РК аб пачатку работы, 7-га лістапада даць рапарт X-му зьезду ЛКСМБ, 25-га лістапада—рапарт IX-му ўсесаюзнаму зьезду.

Райком заклікае ўсю райорганізацыю КСМ мэтадам дзейнай самакрытыкі рашуча выжыць усе перашкоды, якія стаяць на шляху ажыцьцяўленьня гэтага рашэньня— нашага руху наперад.

Абавязваючыся выканаць гэтыя задачы, мы выступаем з прапановай сустрэчнага пляну комсамолу вёскі і выклікаем Полацкі РК, Ветрынскі і другія райкомы комсамолу Беларусі пасьледваць нашаму прыкладу. **Лепельскі райком ЛКСМБ.**

Прыклад ганебнай бязьдзейнасьці

Праца Ушацкага райкому ЛКСМБ занапала. Адсутнічае ўсякае кіраўніцтва над ячэйкай КСМ, у той час, калі праходзяць важныя палітычныя кампаніі, як хлебазагатоўкі, абкладаньні і інш., калі на носе раённая конфэрэнцыя КСМ. Па гэтых пытаньнях ня было нават нарады сэкратароў ячэек. Сам сэкратар і іншыя працаўнікі райкому загабінэціліся ў сваёй працы,—на раён ніхто не выяжджаў, ячэйкі раёну працуюць надзвычайна кепска.

Узброены...,

рэзолюцыя

УШАЦКІ РАЙКОМ ЛКСМ

...„тэмпамі“

Сілосаваньне кармоў па раёне амаль што правалена. Пра мобілізацыю сродкаў райком нават і не падумаў. Атрымаўшы тэлеграму ад ЦК, райкомаўцы толькі зьдзівіліся, што „надта многа напісана“, зьмест тэлеграмы іх менш цікавіў. Палітвучоба таксама не наладжана, мусіць райком і гэтым ня цікавіцца.

Мэтодаў соцспаборніцтва і ўдарніцтва ні ў райкоме, ні на раёне не заўважаецца.

Часта райком бывае замкнуты, бо сэкратар надта любіць блытацца ў сваіх асабістых справах.

Па адозьве ЦК УсеКП(б) нічога ня зроблена. Вярбоўка па падпісцы на „Чырвоную Зьмену“ праходзіць марудна: замест кантрольнай лічбы 153 экз. падана толькі 90 экз.

На вачох райкому зусім занепала Ушацкая раённая ячэйка КСМ. Райком ня бачыць, што ў гэтай ячэйцы ўжо каля трох месяцаў не праводзілася сходаў. Аўтарытэту райком КСМ ня мае.

Селькор **Грыдз.**

Яшчэ сьпяць

15-га лістапада скліваецца X-ты зьезд ЛКСМБ. У Пухавіцкім раёне яшчэ пра гэта ніхто ня ведае і ня чуў. Нават няма ніякай падрыхтоўкі да надыходзячай райконфэрэнцыі ЛКСМБ

Райкому патрэбна зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу і правесьці баявую падрыхтоўку да X-га ўсебеларускага. Патрэбна не пакінуць ніводнага комсамольца, маладога батрака, селяніна, колгасьніка, рабочага, якія-б ня ведалі аб X-м усебеларускім зьезьдзе ЛКСМБ.

Залодзя.

Нашы посьпехі— вынік бальшавіцкай работы

(Яч. ЛКСМБ „Расьсвет Пераможца“)

...ладзь была заўсёды ў першых ...гах у барацьбе за колгас. Ячэйка комсамолу становіцца організатарам моладзі і пачынае даваць лепшыя ...клады работы.

...селі на трактар, цяпер кулака раздушым

...кошт прыбытку купілі трактар, ...даную малатарню за 3500 рубл., ...і 10 жалезных плугоў „Сакко“, ...ружынныя бароны, адну сенакарку, 1 трыер, 2-е конных грабель, ...вяркі і 6 распашнікаў.

...оладзь з энтузіязмам узялася за ...учэньне машын.

...гэтага часу такіх машын і трак... ніхто ў нашай мясцовасьці ня ...ыў у вочы, іх ня было і ў генерала ...ілава.

...Мы селі на трактар, цяпер кулака раздушым,—гаварылі старыя. Ячэйка ЛКСМБ разгарнула культасьветную работу. Організавалі чырвоны ...к, купілі бібліотэку за 300 рублёў,—выручка ячэйкі за звыштэрміновую працу. Дапамагалі ўдовам, сем'ям чырвонаармейцаў, беднякам у ворыве, ...уборцы.

...а работы і жыцьця колгасу стала ...глядацца моладзь.

...ачалі рушыцца сьцены паміж колгаснай і неколгаснай моладзьдзю. З ...выкалічных пёсак моладзь стала ...холзіць у колгасную ячэйку. ...7 год быў одам, калі колгасьнікі ...білі рашучы пералом ва ўзаемаадносінах з навакольным бядняцка-серадняцкім насельніцтвам. Беднаце колгас ...ў безвяротныя ссуды, дарма раз...алі 300 пудоў насеннага аўса, аб...гоўвалі кныром, жарабцом, быкам; ...беднаты—дарма, для серадпякоў— ...плату.

...еўзабаве за імі ў колгас уступіла ...бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. ...пер было ў колгасе 101 гаспадарка. Расьсветаўцы сталі пераможцамі. Гэта была вялікая перамога над кулакамі. Кулакі перайшлі ў адкрытае наступленьне. Пагражалі забо ствам. Не аднаго колгасьніка зьбілі.

„Прымеце нас у колгас“

Так пішуць аднаасобнікі ў сваёй заяве колгасу. Да дня ўраджаю і колектывізацыі колгасьнікі і аднаасобнікі прышлі пад знакам праверкі дасягненьняў колгасу, спайкі колгасьнікаў з аднаасобнікамі ў іх агульнай барацьбе за пяцігодку ў чатыры гады. Колгас падпісаўся на 500 руб. пазыкі: колгасьнікі—на 1225 руб., аднаасобнікі сямі вёсак—на 1565 рублёў.

За гэтыя дні ў колгас уступіла 17 аднаасобных гаспадарак. Моладзь пад кіраўніцтвам ячэйкі комсамолу організуе ініцыятыўныя і вярбовачныя групы.

Сяўбу скончылі датэрмінова, бульбу ўбралі ў тэрмін

Вясеньні сеў колгас закончыў першым на Беларусі, за што атрымаў прэмію—трактар. Азімы сеў скончылі датэрмінова. Пасеяна 210 га жыта, 10 гектараў звыш пляну,—у адказ на адозву ЦК УсеКП(б)!—такі лёзунг колгасьнікаў. Уборка бульбы закончана. Убрана 120 га. Уборка праводзілася мэтадамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. На абвешчаны ячэйкаю вытворчы паход—адгукнулася моладзь аднаасобнікаў. На ўборцы бульбы штодзённа працавала ад 20—40 чал. неколгасьніц дзяўчат. Працавалі брыгадамі. Кожная брыгада моладзі выбірала 1 гектар, які даваў тысячу пудоў бульбы. У брыгадзе працавала 20 чалавек. На кожнага ў сярэднім прыходзілася 50 пуд. бульбы.

Аднаасобнікі на сваіх гонях ня выбіраюць больш 20 пудоў на чалавека ў дзень.

— Мы ў вас навучыліся працаваць па-ўдарнаму,—так кажа неколгасная моладзь.

— Мы даём абяцаньне, што да канца пяцігодкі ўсе будзем у колгасе. І гэта ня проста словы. 7 чалавек моладзі падалі заяву аб прыёме іх у колгас.

Вось яна—ударная, колгасная моладзь

Сьвята „Узьвіжаньне“. Яшчэ ня разьвіднела, а моладзь ужо на полі За ёю—гісторыя. Разам з моладзьдзю— Кавалёва Марфа 55 год. На твары шмат складак—сьляды мінулага цяжкога жыцьця. З-пад падковак—брывей радасьцю сьвеціцца вочы.

— Эх, было-б мне гадоў...

— Дзесяткі тры назад,—сьмяецца комсамолка Палаша.

— Тады-б я была першай комсамолкай.

Комсамолкі: Купцова, Палаша, Старцава Ніна, Майсеева Дарка, Бобрыкава Марфа, Камкова Марфа і шмат беспартыйных дзяўчат, ня гледзячы, што заняты ў аборы, добраахвотна абвясьцілі сябе мобілізаванымі ўдарнікамі па ўборцы жыта, ярыны і бульбы.

Праўленьне вызначала для ўборк 1 га жыта 12 дзён,—брыгады моладзі ўбіралі за 8 дзён.

Моладзь працавала ва ўсе сьвяты і дні адпачынку.

— Ніводнага кілё бульбы зямлі. І з гэтай заданай колгас справіўся.

У касавіцу стварылі пад кіраўніцтвам комсамолу брыгаду з 415 чалавек. За 6 дзён скасілі, пасушылі, перавезьлі і склалі ў стагі 15 га сена. Брыгада дарослых з 22-х чалавек выканала гэту работу за 7 дзён.

Каляндар работы

Колгас распрацаваў вытворча-фінансавы плян на 1931 гаспадарчы год. Ячэйка комсамолу прыняла самы актыўны ўдзел у складаньні пляну, які абгаварылі на сходзе ячэйкі. На сходзе ячэйкі вылучылі прадстаўнікоў моладзі ў плянавыя групы.

Вось каляндар работы.

1. Зімовы пэрыод. З 1 студзеня па 20 красавіка: крухмальны завод, дагляд за жывёлай, возка кармоў, загатоўка апалу, будаўнічых матар'ялаў, вывазка гною, ачыстка насеньня і розныя гаспадарчыя работы.

На ўвесь пэрыод будзе патрачана людзкой сілы 11.843 дні—конскай 5.608 дзён.

II. Вясеньні сеў. З 20 красавіка па 20 мая: узорка, баранаваньне, сяўба, пратручваньне насеньня, работ ў садзе і гародзе. Будзе затрачана 7.797 чалавека дзён і 2.294 конскія дні.

III. Будаўніча-апрацоўчы пэрыод. З 20 мая па 20 ліпеня: будаўніцтва, узорка папару, мэліорацыя, выкапка і вывазка торфу, полка і ўборка канюшыны і часткі сенажаці. Будзе патрачана: 12.896 чалавека-дзён і 3.706 конскіх дзён.

IV. Уборачны пэрыод. З 20 ліпеня па 1 кастрычніка ўборка жыта, сена, яравых культур, асеньняя сяўба, уборка бульбы і малацьба. Будзе затрачана 19707 чалавека дзён і 4710 конскіх дзён.

V Пэрыод падрыхтоўкі да зімы. З 1 кастрычніка па 31 сьнежня: абмалот, зяблевая ўзорка, работа ў садзе, пасадка маладога саду, уборка гародніны, абсталяваньне абораў і пастаноўка жывёлы на стойла.

Што далі гораду

Здана сёлета жыта 10 тысяч пудоў, з якіх 4 тысячы звыш пляну, сыру галяндзкага 600 пудоў, памідораў 600 пудоў, сталовых буракоў 1000 пудоў, морквы 300 пудоў, гуркоў 600 пудоў, таба і махоркі—200 пудоў, масла кароўяга—80 пудоў, крухмалу 12.000 пудоў. Кароў здалі 17 штук, а ў адказ на адозву ЦК УсеКП(б) і ў сувязі з вытворчым паходам комсамолу—здалі дадаткова 10 штук 40 штук падцёлкаў, аўса—2000 пудоў, сьвініны 100 пудоў. парасят 40 штук

Даць пролетарскім цэнтрам максімум продукцыі,—такі лёзунг ячэйкі і ўсіх колгасьнікаў.

Комсамольцы і вучні вырасьцілі на школьным вучастку памідораў на 600 руб. Капусты будзе здана звыш 4000 пудоў.

Школа—цэх колгасу, колгас—шэф школы

Ячэйка комсамолу зусім спраўляецца з задачай політэхнізацыі школ. Пры колгасе ёсьць сямігадовая школа. Пад кіраўніцтвам ячэйкі організаваны ў брыгады, вучні працуюць у майстэрнях і ва палёх. Вывучаюць машыны, трактары. Лік гадзін для кожнай групы ўстанаўліваецца педрадай. Праца вучняў аплачваецца арцельлю. Комсамол рыхтуе кадры для колгасу шляхам організацыі шэрагу гурткоў.

— Школа—гэта наш цэх,—так кажа праўленьне колгасу

— Колгас—гэта наш шэф, так кажуць вучні.

Выканаць вытворчы плян

Ячэйка ставіць за мэту, каб што-б там ні было выканаць намечаны вытворчы плян. Валавы прыбытак выразіцца у 382.388 руб. Вядома, выконваючы плян, ячэйка, як і ўвесь колгас, ня будзе адмяжоўвацца ад аднаасобнікаў.

Ячэйкавыя памылкі і прарывы

Ячэйка дапусьціла вялікую памылку—організацыю асобнай комсамольскай брыгады па ўборцы жыта. Гэтую памылку цяпер выправілі. Ячэйка мае вялікі прарыў на культурным фронце. Цяпер гэта праца разгортваецца. Штотыдзень у клюбе адбываюцца дзьве кіно-пастаноўкі па два сэансы. Організаваны шэраг гурткоў. У асноўным гуртку наведвае колгасная моладзь. Вялікі недахоп—гэта адсутнасьць аднаасобнай моладзі. Кепска працуе ячэйка сярод беднаты,—ня ўсе батракі ўцягнуты ў колгас. Піонэр працы ячэйка аддае недастаткова ўвагі. Слаба вырошчваецца ячэйкавы актыў. Гэтыя прарывы да ўсебеларускага зьезду комсамолу ячэйка абавязуецца ліквідаваць

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі—за выкананьне трэцяга году пяцігодкі, за новую перамогу.

Ц. ГАРБУНОЎ.

ЦК КОМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ АБ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЕ НА ЗАХ. УКРАІНЕ

...„Ні гроша падаткаў фашысцкаму ўраду“...

ВАРШАВА. Апублікавана рэзолюцыя ЦК польскай компартыі аб становішчы на Заходняй Украіне. У рэзолюцыі гаворыцца наступнае:

„1. Польскі імпэрыялізм імкнецца да максымальнай эксплёатацыі заваяваных абласьцей і да іх пашырэньня пры дапамозе новых заваёў шляхам новага паходу на Кіеў. Страшэннае нацыянальнае і колёніяльнае прыгнечаньне складае неад'емную частку польскай окупацыйнай політыкі на Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі.

Імпэрыялістычнае гаспадараньне польскага фашызму ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі зрабіла працоўныя масы гораду і вёскі ахвярамі агіднейшага гвалту і прыгнечаньня. Нячуваная эксплёатацыя батракоў і сялянскай беднаты, якія працуюць у абшарніцкіх маёнтках амаль на нявольніцкіх умовах, фашысцкая ліквідацыя фэўдальных перажыткаў (зямляналаджаньне, адмена сэрвітутаў), праведзеная ў гэтых абласьцях з асаблівай жорсткасьцю і бязьлітаснасьцю), ваенная колёнізацыя на землях, адабраных у ўкраінскіх сялян, якая азначае рабаўніцтва сялянскіх мас, квотніцкія процанты, якія здымаюцца прыватнымі і дзяржаўнымі банкамі, падатковы цяжар для падтрыманьня окупацыйнага рэжыму, нацыянальнае прыгнечаньне і поліцэйскі тэрор,—усё гэта ператварыла Заходнюю Украіну ў пекла для шырокіх працоўных мас.

Глыбокі эканамічны крызіс, які расхіствае асновы капіталістычнага панаваньня ў Польшчы, яшчэ больш пагоршыў становішча працоўных мас у окупаваных абласьцёх. Масы зразумелі, што ў іх няма другога выхаду, акрамя рэвалюцыйнай барацьбы за выгнаньне буйных абшарнікаў, польскай поліцыі, жандараў, шпікаў і фашысцкіх окупантаў, барацьбы за непакаранае атрыманьне зямлі. На гэткую барацьбу окупанты адказваюць ваеннымі і поліцэйскімі карнымі экспэдыцыямі і пагромамі цэлых украінскіх вёсак.

Масавыя падпалы буйных абшарніцкіх маёнткаў і кулацкіх гаспадарак, барацьба з польскай фашысцкай адміністрацыяй зьяўляюцца праявамі рэволюцыйнай барацьбы асноўных мас сялянства і працоўнай інтэлігенцыі з польскім імпэрыялізмам.

Украінская буржуазія падае ніц перад фашысцкімі заваёўцамі і асуджае рэволюцыйны рух мас.

Усе фракцыі украінскага нацыяналізму вядуць перагаворы з польскім фашызмам адносна сумеснага наступленьня на Савецкую Украіну.

Украінская ваенная організацыя (УВО) імкнецца разьбіць фронт змагаючыхся працоўных мас Заходняй Украіны, распыліць і ўдушыць іх барацьбу, пазбаўляючы гэтую барацьбу з прыгнечаньнем окупантаў і эксплёатацыяй буйных абшарнікаў і капіталістых яе соцыяльнага зьместу.

Усе фракцыі польскага фашысцкага лягеру ад „Санацыі“ (урадавы лягер) да ППС, „Вызваленьня“ і сялянскай партыі выказваюць сваю солідарнасьць і дапамагаюць Пілсудзкаму ў прыдушэньні рэволюцыйнага руху украінскіх мас і падрыхтоўцы новага паходу на Кіеў.

2. Польская компартыя разам з компартыяй Заходняй Украіны зьяўляецца адзінай партыяй, якая прызнае сучасную барацьбу украінскіх мас з буйнымі зямляўласьнікамі, польскімі кулакамі-калёністымі і польскім окупацыйным рэжымам сваёй барацьбой.

Задача польскай компартыі заключаецца ў мобілізацыі самых шырокіх працоўных мас гораду і вёскі з мэтай падтрыманьня гэройскай барацьбы украінскіх мас з окупантамі за права самавызначэньня Заходняй Украіны, да адлучэньня і далучэньня да Савецкай Украіны, барацьбы за беззваротнае разьмеркаваньне зямлі сярод сялян і батракоў. Партыя павінна растлумачыць масам немагчымасьць ніэрынуцьця фашызму без барацьбы не на жыцьцё, а на сьмерць з пальскім імпэрыялізмам, які ўціскае Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь і які падрыхтоўвае паход на Савецкую Украіну і Савецкую Беларусь.

На барацьбу Пілсудзкага з украінскімі працоўнымі масамі партыя павінна адказаць організацыяй сходаў, масавых дэмонстрацый на вуліцах, політычных масавых забастовак ва ўсёй Польшчы. Прыклад гэройскай барацьбы украінскага сялянства павінен зьявіцца штуршком для барацьбы сярэдніх і дробных сялян усяе Польшчы з капіталістымі, буйнымі абшарнікамі і кулакамі за зямлю, за ніспрынупьце фашызму; за рабоча-сялянскі ўрад.

3. Баявая задача компартыі Заходняй Украіны заключаецца ў барацьбе з усялякага роду пасыўнасьцю ў зьвязку з масавым рухам, які ў Заходняй Украіне ўсё больш і больш узмацняецца. Партыя павінна падвоіць сваё напружаньне за аўладаньне сучасным стыхійным масавым рухам. Для гэтай мэты неабходна організаваць масавую барацьбу з падатковым уціскам окупантаў пад лёзунгам: „Ні граша падаткаў фашысцкаму



Твар пілсудчыны

ўраду“, супроць фашысцкай комасацыі, супроць уплаты штрафаў, накладзеных фашызмам на паўстанскія вёскі, супроць прымусовага вартаваньня буйных маёнткаў і дзяржаўнай маёмасьці.

На карныя экспэдыцыі окупантаў, на штрафы, якія накладзены на украінскія вёскі, на масавыя арышты рабочыя павінны адказаць політычнымі, масавымі забастоўкамі і дэмонстрацыямі.

Трэба імкнуцца да ўтварэньня супольных рабоча-сялянскіх камітэтаў, якія ахоплівалі-б горад і суседнія вёскі і кіравалі-б агульнай барацьбой.

Партыя павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на організацыю масавай самаабароны і брыгад самаабароны на фабрыках і вёсках.

Мобілізацыя працоўных мас гораду і вёскі на Заходняй Украіне для барацьбы з польскім імпэрыялізмам, окупацыяй, фашызмам і соцыял-фашызмам, захоп у свае рукі кіраўніцтва сучасным стыхійным рухам сялянскіх мас і ўвязваньне гэтага руху з барацьбой пролетарыяту, пропаганда програмы дыктатуры пролетарыяту,—усе гэтыя задачы павінны ляжаць у аснове нашай перавыбарнай кампаніі на Заходняй Украіне“.

Бандыцкія атрады арудуюць

ТОКІЁ. З Харбіну паведамляюць, што за апошнія дні белагвардзейскія атрады паладзілі шэраг нападаў на аўцаводчую гаспадарку КУ чыгункі на станцыі Чжаромце.

Харбінская газэта „Дуньшэн-Шыбао“ паведамляе:—„Рускія банды рыхтуюцца да зімоўкі. У 100 кілёмэтрах ад Хайлара, на Заходняй лініі Кітайска-Усходняй чыгункі разьбіта 500 палатак на 10 чалавек кожная і ўстаноўлены абараніцельныя заставы, што прыдае бандыцкім атрадам выгляд рэгулярных войск.

Гвалтоўнае апалячваньне Заходняй Беларусі

ВАРШАВА, 14 Настаўнікі Беларускай настаўніцкай сэмінарыі ў Вільні падалі ў адстаўку ў знак протэсту супроць патрабаваньня ўраду выкладаць гісторыю і геаграфію на польскай мове.

Фашыстыя рыхтуюць пераварот

ГЕЛЬСЫНГФОРС. Становішча ў краіне робіцца ўсё больш напружаным. Бязумоўна, фашыстыя рыхтуюць пераварот і адкрытае абвяшчэньне фашысцкай дыктатуры. Па чутках, у якасьці дыктатара намячаецца буйны леспрамыслоўца, фабрыкант Вальдэн.

Сваёй бліжэйшай програмай фашыстыя высоўваюць патрабаваньні зьмены конституцыі, якая прадугледжвае перадачу ўсяе паўнаты ўлады незалежнаму ад сойму ўраду. Фашыстыя патрабуюць таксама зьмены пропорцыянальнай сыстэмы выбараў у сойм, адмаўленьня ад соцыяльнага законадаўства і асабліва соцыяльнага забясьпечаньня, зьмены падатковага абкладаньня з ускладаньнем усяго падатковага цяжару на рабочых і сялян, адмены забарончага закону на алькаголь і значнага павялічэньня выдаткаў на ваенныя патрэбы.

Орган соцыял-дэмократаў абмяжоўваецца нескладным гэлопатам „протэсту“ супроць апошніх фашыстых. Газэта, аднак, тут-жа сьцьвярджае супакоіць фашыстых, што адмена сыстэмы пропорцыянальных выбараў не палохае соц. дэмократычную партыю, якая пры сыстэме выбараў па акругах „спадзяецца нават на выйгрыш левых галасоў“.

Ізноў „аграрная“ конфэрэнцыя, ізноў загаворы супроць „савецкага дэмпінгу“

ПРАГА. Орган нямецкіх аграрыяў „Дэйчэ Лейбфэст“, які выдаецца ў Празе прысьвячае артыкул пытаньням савецкага экспорту. Газэта сьцьвярджае што бухарэсцкая конфэрэнцыя аграрных краін (удзельнікаў Варшаўскае „аграрнае“ конфэрэнцыі), якая адчыняецца 18 кастрычніка, „у першую чаргу будзе накіравана супроць савецкага дэмпінгу“.

ВЫКАНАЕМ АБАВЯЗКІ

Ня гледзячы на тое, што тэрмін распаўсюджваньня вэлёабавязацельстваў ужо прайшоў, кантрольныя лічбы па БССР ня выкананы.

Гэты прарыў паказвае, што адпаведныя організацыі да гэтага часу недастаткова мобілізавалі ўвагу працоўных мас.

У зьвязку з адозвай ЦК УсеКП і праводзімай кампаніяй па мобілізацыі рэсурсаў, ЦК ЛКСМБ прыняў выклік ЦК КСМ Грузіі на соцспаборніцтва па распаўсюджваньню вэлёабавязацельстваў на 4000 штук 4 серыі.

Гэта сопумова, якая забясьпечвае выкананьне кантрольных лічбаў, бязумоўна можа быць выканана пры ўзмоцненай растлумачальнай працы і практычным удзеле ўсяго комсамолу, які павінен пераключыць сваю працу на выкананьне гэтага абавязацельства.

З пункту погляду магчымасьцяй, якія маюцца ў гэтым напрамку, як, напрыклад, распыленасьць населеных пунктаў, недахоп транспартных сродкаў, а таксама прыймальнасьць умоў і ўдзел комсамолу ў спорце, вэлёсыпэд больш за ўсё павінен зацікавіць працоўную моладзь.

Акрамя асабістых выгад для моладзі, набыцьцё вэлёсыпэда шляхам наступовага мотавага накапленьня дае магчымасьць нашай мэталапрацоўчай прамысловасьці на ўдзежаныя насельніцтвам па вэлёаба[вяза]цельствам сродкі пабудаваць [...] свае новы вэлёсыпэдны завод [і] шырыць заводы ў Пэнзе і Хар[кове].

З мэтай пасьпяховага выка[нань]ня соцспаборніцтва паміж ЛКСМБ і Грузіі, комсамольскім [ор]ганізацыям трэба правесьці [...] сярод рабочай, а галоўным ч[ынам] працоўнай сялянскай моладзі.

Растлумачальная і практы[чная] праца па рэалізацыі вэлёаба[вяза]цельстваў павінна праходзіць [пры] шырокім удзеле грамадзкасьці [...] равазжна па лініі фізкультур[ных] аўтадораўскіх організацый, павінны ахапіць у першую [чаргу] як самыя комсамольскія орга[нізацыі], так і соцыялістычны [...] вёскі—колгасы і саўгасы.

Уся праца комсамольскіх ор[ганізацый] павінна праходзіць на [асно]ве складаньня кадру інды[віду]альных вярбоўшчыкаў сярод асобных комсамольскіх ячэек, [орга]нізацыі ўдарных брыгад па [...] прыемствах, установах, саўга[сах], колгасах і соцспаборніцтва мі[ж] асобнымі ячэйкамі.

Комсамол, які заўжды ста[яў] у першых шэрагах ус[і]х пачынан[ьняў] партыі і ўраду, бязумоўна вы[кана]е тыя абавязкі, якія ўзяў на [сябе] ЦК ЛКСМБ.

Чакорск[...]

Адказны рэдакт[ар] ...
Рэдкол[егія]

ТЫРАЖ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“—20.400 экз.
КОМСАМОЛЬЦАЎ У БССР — —85.000

1/4 частка комсамольскай організацыі Беларусі выпісвае газэту.
Астатнія ня выпісваюць, магчыма і ня чытаюць газэту.

ПА ПАДПІСЦЫ ІДУЦЬ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ:

1. Слуцак
2. Петрыкаў
3. Самахвалавічы
4. Плешчаніцы
5. Сьмілавічы

АДСТАЮЦЬ:

1. Лепель
2. Жлобін
3. Дуброўна
4. Сіроціна
5. Шклоў.

Ганебна цягнуцца ў хвасьце.

РАЁНЫ

1. Гомельскі вясковы 18 экз.
2. Хоцімскі—27 экз.
3. Камарынскі—35
4. Межынскі—39
5. Чэрыкаўскі—43

Ячэйкі ЛКСМБ, упаўнаважаныя „Ч. З.“, юнкоры, чытачы, безадкладна разгарнеце працу па распаўсюджваньню газэты да X зьезду комсамолу Беларусі, павялічвайце тыраж сваёй газэты.

„Чырвоная Зьмена“ павінна мець 40000 экз.

Слухай, юнкорыя!

У панядзелак 20 кастрычніка а 6-й гадзіне адбудзецца

агульна-гарадзкая нарада юнкораў

з наступнай павесткай дня: 1. Удзел юнкораў у падрыхтоўцы да 3-га году пяцігодкі і Х-га зьезду ЛКСМБ, 2. Аб дзейнасьці юнкораўскіх заметак. Пасьля нарады—паход у кіно.

ТВАЯ ЯЎКА АБАВЯЗКОВА. РЭДАКЦЫЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ“

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна